ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 11(286) 22 — 29 сакавіка 2003 г.

ПО ПОВОДУ

DEJA VU

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Почему-то теперь вся белорусская политика дается мне в ощущении, что все это уже было. Манифестация оппозиции 12 марта похожа на те, что когда-то тоже начинались от площади Якуба Коласа и также заканчивались у ближайшего милицейского кордона. А 16 марта I Всебелорусское собрание интеллигенции состоялось в том же самом месте, что и II съезд движения БНФ в марте 1991 года.

Ба, знакомые все лица и хорошо мне известные были среди 414 делегатов и 216 гостей I Всебелорусского собрания интеллигенции! Казалось, от них и ожидать нечего, кроме благих пожеланий типа: хорошо бы, хорошо бы нам сома поймать большого. И это мягко говоря и по большому счету.

Тогда писать по поводу мероприятия, имевшего место быть в доме культуры ОАО «Сукно», было бы проще простого. Расчехвостить всю оппозицию в пух и прах, и вся недолга. Но сделать этого не позволяет странное чувство *deja vu*. Ведь такое уже было ровно двенадцать лет тому назад на съезде БНФ.

Тот минувшего века съезд БНФ тоже можно назвать первым. Тогда впервые члены движения собрались на свой съезд в Минске, а не в Вильнюсе. Пусть в первый раз проходит столь представительное собрание белорусской интеллигенции. Но, увы, в марте 2003 года по-прежнему обсуждаются все те же извечные белорусские вопросы.

Все возвращается на круги своя. Снова на повестке дня дилемма: независимость от Москвы или подчиненность кремлевским правителям. Опять дискутируются проблемы коммуникативных и мыслеобразующих функций белорусского языка. Как и на том давнем съезде БНФ, на Всебелорусском собрании интеллигенции задается все тот же риторический вопрос о выборе модели экономического развития страны.

Как и прежде, ощущается легкий холодок тревоги в преддверии грандиозных политических событий. Но в марте 1991 года это ожидание сопровождалось приятно-противным предвкушением распада СССР, крушения коммунистической системы и предчувствием гражданской войны.

Сейчас тоже смешанные тревожные чувства не покидают делегатов и гостей Всебелорусского собрания интеллигенции из-за явной угрозы национальной независимости. Тогда на наших глазах проходил крах Советского Союза, теперь подобная участь, возможно, уготована и Республике Беларусь.

Как и 12 лет назад, серьезное беспокойство вызывает состояние белорусской экономики. Хотя тогда разваливалось плановое хозяйствование, а теперь доморощенное рыночно-социалистическое, но президентский хрен отнюдь не слаще коммунистической редьки для интеллигентных белорусов.

Чем кончится долгая зима тревоги нашей? Что же будет с Родиной и нами? Что день грядущий мне готовит? Под этими и другими вопрошающими цитатами вполне мог подписаться каждый из делегатов и гостей нашего интеллигентского собрания.

Печально, если мы оказались в порочном круге, и за дюжину прошедших лет ничего не изменилось. Чуть более оптимистично рассматривать все как развитие по спирали, где мы оказались на новом витке истории. А если белорусская суверенность уже сорвалась в штопор? Штопор ведь тоже есть спираль.

Тут мне по-интеллигентски вроде бы надо зябко поежиться от столь страшноватой метафоры. Но как интеллектуалу, далекому от пресловутой мягкотелости, даже в непривычной для себя шкуре инсайдера не составляет особого труда продолжить нить отстраненных рассуждений. Пусть даже, по моему личному мнению, Беларусь находится накануне национальной катастрофы.


Итак, первому собранию белорусской интеллигенции не дано было найти способы разрешения каких-либо проблем и внутренних конфликтов, стоящих перед страною и людьми. На это собрание никто не возлагал и не возлагает таких политических надежд, как на движение БНФ в 1991 году. Ни я, ни кто-либо другой не будут разочарованы, если оргкомитету собрания не удастся сформировать дееспособную Раду белорусской интеллигенции.

И без того действительность обнадеживает. Поскольку впервые в новой истории Беларуси ее интеллигенция перестает быть вещью в себе. Оказывается, она все-таки есть, эта интеллигенция, не масса индифферентная, а совесть страны и честь.

Будь я марксистом преклонных годов, то обязательно подытожил, что белорусская интеллигенция понемногу становится не прослойкой, а новым классом. Однако проще и вернее сказать, что на наших глазах постсоветская интеллигенция становится элитой и солью земли белорусской.

Стране, действительно, необходима авторитетная и консолидированная элита, обладающая моральным правом говорить от имени тех, кто все еще надеется жить в свободной и богатой Беларуси. И понимает, что без свободы и независимости ни о каком потребительском благополучии говорить не приходится.

Всегда и везде вначале было слово. Хочется верить, что в марте 2003 года оно было кем-то сказано. Пройдет время, и станет ясно, прозвучало ли это слово из уст кого-либо из делегатов Всебелорусского собрания интеллигенции. Может, слово истины походя обронил некий скучный гость или мрачный журналист, наблюдавший за собранием. Или оно позже даст о себе знать, пока оставшись не замеченным в какомнибудь приветствии из эмигрантского далека. Все может быть. ■



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Зачем рубить окно, когда открыта дверь», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-ДАЛИ

ДАЙДЖЕСТ

Завтра была война

Какой будет новая Война в Заливе? Какую тактику собирается применить Пентагон, и что способен противопоставить им Багдад. Предлагаем вам обзор мировой прессы, посвященный сценариям будущего кровопролития.

Washington Post

— На самом деле американская армия давно уже задействована в различных районах Ирака. Это пролог войны. Минимум дюжина разведывательных групп ежедневно проникает в Ирак. Цель их миссии – изучить транспортную инфраструктуру, нащупать слабые места в тылу иракцев, что позволит американцам, едва только Буш даст приказ, быстро продвинуться вглубь иракской территории. Анализируя задачи разведки, можно предположить, что разработанный Пентагоном план нынешней войны в корне отличен от кампании 1991-го. Вместо массированных бомбардировок, главные действия будут разворачиваться на земле. Цель — захват территории, чтобы сомкнуть кольцо вокруг Багдада. Наш источник в Пентагоне так коммен-

Окончание на стр. 5

БАЛКАНЫ

Выстрелы в Белграде

ОЛЕГ ПЕТРОВ

После свержения Милошевича Сербия ушла с первых страниц СМИ. Случайный наблюдатель мог бы подумать, что страна тихо и спокойно идет к демократии. Как показало убийство премьера Джинджича, все обстоит сложнее.

Премьер-министр, лидер Демократической партии, Зоран Джинджич был убит при выходе из здания правительства в Белграде. Стреляли из снайперской винтовки «Застава» М-69 калибра 7,9 миллиметра, снабженной оптическим прицелом системы «воздух», дающим увеличение до 32 раз. Эти винтовки сняты с производства почти 20 лет назад, поэтому найти хозяина по характерным данным оружия сложно.

Выстрелы были произведены с расстояния около 300 метров из офисного здания, в помещениях которого производился ремонт. По всей видимости, убийство совершил профессионал. Джинджич умер два часа спустя, несмотря на старания врачей. Центр города сразу был оцеплен полицией, все дороги из города заблокированы, тысячи людей вынуждены были возвращаться с работы пешком. Людей и автомашины беспорядочно обыскивали. Как говорят свидетели, после выстрелов снайпера некие молодые люди стали вести беспорядочную стрельбу из пистолетов, сея панику, что позволило киллерам скрыться. Почти сразу в стране было введено чрезвычайное положение – запрещены любые митинги, забастовки или демонстрации. Страна в шоке.

ЖЕРТВА

Зоран Джинджич родился в 1952 году, поступил в Белградский университет, где изучал философию. Образование завершал в Германии в университете Констанцы, где увлекся левыми идеями. Там флиртовал с анархизмом, а после своего возвращения в Белград начал участвовать в диссидентском движении. Был приговорен к одному году тюрьмы. Когда титовская бюрократия начала терять власть, Джинджич в 1989 году стал одним из основателей первой оппозиционной партии в Югославии (Демократическая партия). К этому времени от его ультралевых взглядов не осталось и следа: Джинджич трансформировался в убежденного либерала.

В течение 90-х, когда шла война в Боснии, Джинджича за открытую прозападную позицию почитали за предателя. Но после свержения Милошевича он оказался единственным лидером оппозиции с организацией и инфраструктурой, способными руководить госаппаратом. Рейтинг у него был очень низкий. На посту премьера Джинджич проводил откровенно прозападный курс, что вызывало раздражение даже демократа Коштуницы. Националисты, в свою очередь, не простили Джинджичу его решение выдать Милошевича гаагскому трибуналу.

УБИЙЦА

На этот счет существует масса версий: шальных и похожих на истину. Можно выбрать любую.

Мафия. Всякий раз, когда не знают, кто преступник, всех

Окончание на стр. 4

АНЕКДОТ-С

Маленький мальчик с плачем прибегает на кухню к родителям.

– Там по телевизору меня все время пугают: «Съест БНФ, съест БНФ!»

– Ничего страшного, сынок. Это они, наверное, про Всебелорусский съезд интеллигенции рассказывают.

***

– Чем лукашенковский флаг отличается от светофора?

– На светофоре все сигнальные цвета равны, а на флаге слишком много запретительного, очень мало разрешительного и совсем нет предупредительного.

НАВІНЫ

Паход. Рашэннем Страйкавага камітэта прадпрымальнікаў у Беларусі абвешчана новая акцыя пратэсту прадпрымальнікаў «паход у парламент». 1 красавіка 2003 года прадстаўнікі прадпрымальнікаў розных рэгіёнаў а дзесятай раніцы маюць намер прыйсці да будынку Нацыянальнага сходу і Рады міністраў. Асноўных патрабаванняў чатыры: адмяніць новыя дэкрэты прэзідэнта, якія звязаны з сацыяльным страхаваннем, аб адзіным падатку для прадпрымальнікаў, спыніць канфіскацыю маёмасці ў грамадзян па фармальных і надуманых прыкметах, зменшыць стаўкі адзінага падатку ўтрая, зменшыць аплату за камунальныя паслугі для насельніцтва да сумы, якая не будзе пераўзыходзіць 30 адсоткаў ад пражытковага мінімуму.

Воля. Арганізатары народнага маршу «За лепшае жыццё!» заклікаюць усе палітычныя і грамадскія сілы краіны падтрымаць акцыі пратэсту 25 сакавіка (Дзень волі) і 26 красавіка (Чарнобыльскі шлях). Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску заявілі сябра аргкамітэта грамадзянскай ініцыятывы «Хартыя'97» Мікалай Халезін, каардынатар руху «Зубр» Уладзімір Кобец, старшыня грамадскага аб'яднання «Перспектыва» Анатоль Шумчанка, намеснік старшыні Страйкама прадпрымальнікаў Леанід Каліценя. Удзельнікі прэс-канферэнцыі паведамілі таксама, што зараз выпрацоўваецца агульны стратэгічны план апазіцыі па дзеяннях. Гэты план, паводле іх слоў, будзе давед-зены да ведама ўсіх партыйных актывістаў, пройдзе яго ўзгадненне. І прыкладна праз тры-чатыры тыдні ён пачне ажыццяўляцца.

Рабаванне. У ноч на 15 сакавіка невядомыя абрабавалі кватэру, у якой знаходзіцца прэс-цэнтр руху «Зубр». Зламыснікі перапілавалі краты вакна і трапілі ў кватэру, якая знаходзіцца на першым паверсе. Быў скрадзены сістэмны блок кампутара, на якім знаходзілася інфармацыя. Праца прэс-службы руху часова паралізаваная. Больш нічога ў кватэры не знікла. Лідэры руху звязваюць выкраданне тэхнікі з актывізацыяй «Зубра» і актыўным удзелам у маршы «За лепшае жыццё!».

Кошты. Паводле вынікаў лютага, спажывецкія кошты ў Беларусі выраслі на 1,9 адсотка, а за 11 дзён сакавіка – яшчэ на 1,3 адсотка. У студзені спажывецкія кошты павялічыліся на 4,3 адсотка. Такім чынам, з пачатку года іх рост склаў 7,7 адсотка пры гадавым прогнозе ўраду і Нацыянальнага банка 18–24 адсоткаў. За студзень-люты і першы тыдзень сакавіка 2002 года кошты ў Беларусі павялічыліся на 10,8 адсотка. У лютым 2003 года спажывецкія кошты ў Расіі выраслі на 1,6 адсотка (з пачатку года – на 4,1), ва Украіне – на 1,1 (на 2,6), у Казахстане – на 0,5 (на 1,5).

Фонд. Былы кіраўнік барысаўскай арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Аляксандр Абрамовіч, які ўвосень 2001 года эміграваў у ЗША і цяпер жыве ў Атланце, стварае фонд падтрымкі землякоў-апазіцыянерыў. Як патлумачыў Аляксандар Абрамовіч, размова ідзе пра падтрымку людзей, якія за сваю партыйную, грамадскую ці незалежную журналісцкую дзейнасць былі рэпрэсаваныя ўладамі, у тым ліку засталіся без працы, а значыць, і без сродкаў для існавання. Ужо цяпер у фондзе «*штосьці ёсць*», сказаў Абрамовіч. Аднак для таго, каб дапамога аказвалася ўсім пацярпелым беларускім дэмакратам, а не толькі барысаўскім актывістам, ён вядзе перамовы з прадстаўнікамі беларускай дыяспары ў Злучаных Штатах. Перад ад'ездам за мяжу Аляксандр Абрамовіч заявіў, што прадстаўнікі беларускіх спецслужб пагражалі ягонаму жыццю. Цягам двух гадоў ён са сваімі барысаўскімі аднадумцамі вёў бестэрміновую акцыю грамадзянскага непадпарадкаваньня выканаўчай уладзе.

Песняры. Пытанні ўвекавечання памяці Уладзіміра Мулявіна абмяркоўваліся на нарадзе з удзелам прэзідэнта Лукашэнкі. «*Самы лепшы помнік Уладзіміру Мулявіну – гэта далейшая праца створанага ім ансамбля «Песняры»*, – упэўнены Лукашэнка.

Медаль. Цэнтрвыбаркам Беларусі хадайнічае аб узнагароджанні супрацоўнікаў МУС, якія забяспечвалі грамадскі лад пад час нядаўніх выбараў у мясцовыя саветы. Адпаведны ліст за подпісам старшыні Цэнтрвыбаркама накіраваны міністру ўнутраных спраў. Паводле словаў сакратара ЦВК Мікалая Лазавіка, выбары «*прайшлі без адзінага інцыдэнту*», а пад час датэрміновага галасавання міліцыянты дзяжурылі на выбарчых участках нават па начах, ахоўваючы дакументацыю.

Заробак. Працаўнікі бабруйскага броварнага ААТ «*Дедново*» патрабуюць ад кіраўніцтва прадпрыемства выплаты належнага ім заробку, запазычанасць па якім пачалі назапашвацца яшчэ з верасня мінулага года. Калі грошы да 20 сакавіка не будуць сплочаныя, то рабочыя гатовыя абвесціць страйк. Пра гэта яны заявілі ў лісце на імя дырэктара бровару. Пад петыцыяй паставілі свае подпісы больш за 150 чалавек – прыкладна палова працоўных прадпрыемства. Дырэктар завода Мар'ян Шафарэвіч не назваў дакладнай сумы запазычанасці па заробку і заявіў, што «*кожны дзень грошы патрошку сплочваюцца*». Разам з тым, кіраўнік прызнаў становішча прадпрыемства цяжкім. Прычына ў тым, што завод, які знаходзіцца на рэканструкцыі, прыпыніў выпуск піва – значыць, няма магчымасці атрымліваць грошы ад гандлю.

Прэмія. Рэдактар закрытай уладамі гродзенскай газеты «Пагоня» Мікола Маркевіч і газета «*Белорусский рынок*» сталі лаўрэатамі прэміі Герда Буцэрыюса «Маладая прэса Усходняй Еўропы» 2003 года нямецкага фонду «Цайт-Штыфтунг». Прэмія ў гонар заснавальніка фонду і былога рэдактара нямецкай газэты «Цайт» Герда Буцэрыюса, прысуджаецца фондам з 1999 года. Ён уганароўвае ёй ўсходнееўрапейскія друкаваныя сродкі масавай інфармацыі і асобных журналістаў за прафесіяналізм і грамадзянскую мужнасць.

Канфлікт. Як паведаміў лідэр Маладога фронту Павел Севярынец, чальцоў МФ выгналі з офісу БНФ. Падстава – яны вялі падрыхтоўку да шэсця 23 сакавіка, адным з арганізатараў якой з'яўляецца выключаны з партыі БНФ Вячаслаў Сіўчык. Фронт, як вядома, рыхтуе акцыю на Дзень Волі 25 сакавіка. МФ лічыць сябе незалежнай арганізацыяй і не збіраецца станавіцца фронтаўскім камсамолам. Бліжэйшы сойм партыі канчаткова вызначыць адносіны паміж МФ і БНФ.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



«Когда вы пытаетесь заменить черный и белый картриджи на новые, то ваш принтер начинает издавать неблагонадежные звуки»

(И. Курлуков, «Компьютерная газета», 11.03.03)



«Резиденты увеличивают выпуск продукции»

(В. Борисов, «Народная газета», 19.03.03)



«Драматический роман между Старым Светом и Россией может кончиться счастливой развязкой»

(Н. Шелдышева, «Республика», 19.03.03)

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Гуманнасьць да жывёлаў

ЮЛІЯ ДРАНЧУК

Закон аб стасунках з жывёламі мае быць прыняты на бліжэйшай сэсіі Палаты прадстаўнікоў. Днямі адбылося пашыранае паседжаньне яе камісіі па праблемах Чарнобыльскай катастрофы, экалёгіі і прыродакарыстаньня, дзе сумесна з прадстаўнікамі грамадзкасьці і журналістамі быў абмеркаваны законапраект.

Сёньня ў нашай краіне няма адмысловага закону, паводле якога гарамадзяне мусяць ставіцца да жывёлаў. Ёсьць толькі шматлікія пастановы Міністэрства жыльлёва-камунальнай гаспадаркі, Міністэрства сельскай гаспадаркі, Рады міністраў і Менгарвыканкаму. Усе гэтыя пастановы пачасту перакрыжоўваюцца і ўзаемна выключаюць адна адну.

Першасны праект закону быў меншы за сёньняшні ў тры разы. Цяпер ён складаецца з 7 частак і 39 артыкулаў і ўлучае ў сябе прынцыповыя аспэкты стасункаў з жывёламі: хатнімі і бадзяжнымі.

Грамадзкія аргнізацыі па абароне жывёлаў незадаволеныя шмат якімі аспэктамі праекта, хоць і прызнаюць, што камісія прыслухалася да меркаваньняў, дзякуючы чаму новы праект і патаўсьцеў утрая.

Першае, на чым акцэнтуюць увагу праваабаронцы жывёлаў, – гэта назва закона. У большасьці краінаў гэткія адпаведныя законы называюцца «па абароне жывёлаў». Гэткая фармулёўка красамоўная і кажа сама пра сябе. А вось беларускі законапраект пра стаўленьне да жывёлаў – гучыць досыць размыта, мяркуе юрыст грамадзкай арганізацыі «Ратаваньне» Рыгор Фёдараў: «*Тое, як называецца закон, наўпрост зьвязана зь ягоным зьместам – прыкладам, там няма нормаў, накіраваных на абарону жывёлаў ад жорсткага стаўленьня, накіраваных на патрабаваньне гуманнасьці да іх у розных сытуацыях – такіх нормаў у законе вельмі мала. Замест гэтага там прысутнічае бясконцая адказнасьць уладальнікаў за жывёлінаў перад грамадзкасьцю*».

Асабліва незадаволеныя абаронцы жывёлаў артыкулам, паводле якога колькасьць хатніх жывёлаў абмяжоўваецца дзьвюма. Большая колькасьць дазваляецца зь пісьмовага дазволу ўсіх суседзяў. Шмат хто назваў гэткае абмежаваньне абсурдным. Працягвае Рыгор Фёдараў: «*Натуральна, норма наконт дзьвюх жывёлаў абсалютна непрымальная. На мой погляд, усё гэта павінна рэгулявацца іншым чынам: павінна быць напісана, што можна трымаць жывёлаў і ў шматкватэрным доме, і ў прыватным сэктары, але павінна быць пазначана, што мясцовыя выканаўчыя ворганы маюць права абмяжоўваць гаспадара ў колькасьці ўтрыманых жывёлаў у выпадку аб'ектыўна абгрунтаваных скаргаў суседзяў*».

Яшчэ адна прагаліна ў праекце тычыцца ўтрыманьня бадзяжных жывёлаў пасьля адлову і правілаў іх зьнішчэньня ў выпадку адсутнасьці гаспадароў. Рэч у тым, што на сёньняшні дзень служба адлову не трымае справаздачу за тыя рэчывы, якімі яна карыстаецца для забойства жывёлаў. Праект, які зараз рыхтуецца, пакуль што ніяк не акрэслівае дадзены аспэкт.

Дэпутаты камісіі Палаты прадстаўнікоў мяркуюць, што закон трэба прыняць, а потым яго дапрацоўваць. У кожным разе, яны абяцалі ўважліва разгледзець усе выказаныя прапановы і прыслухацца да большасьці слушных. Прапановы ад грамадзкіх арганізацыяў і грамадзянаў Беларусі прымаюцца да разгляду да 1 красавіка.

■

НАПЯРЭДАДНІ

БНР не падзялілі

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Упершыню Дзень Волі будзе адзначацца ў Беларусі двойчы — 23 і 25 сакавіка. Ініцыятары святкавання так і не дамовіліся аб супольнай акцыі па святкаванні 85-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі.

Некаторыя аглядальнікі ахрысцілі тое, што адбываецца з вулічнымі акцыямі апазіцыі, як крызіс жанру. Першая масавая акцыя 12 сакавіка сабрала стандартную колькасць удзельнікаў – па розных ацэнках, ад 2 да 5 тысячаў. Гэта мяжа, якую арганізатарам масавых мерапрыемстваў не ўдаецца пераадолець колькі гадоў запар. Крытыкі маршу 12 сакавіка, што дакаралі яго ініцыятараў за няўзгодненае рашэнне і фальстарт напярэдадні Дня Волі, наступілі на тыя ж самыя граблі. Нацыяналісты, якім традыцыйна належыць манаполія на святкаванне, умудрыліся раскалоць галоўную вясеннюю акцыю на дзве.

Як заўсёды, вінаватымі аказаліся журналісты. «*Яны любяць скандалы*, – заявіў намеснік старшыні нацыянальнага аргкамітэта па святкаванні 85-х угодкаў БНР Сяргей Законнікаў. – *Нам трэба меней даваць скандалаў, якія адбываюцца ў апазіцыі, не выстаўляць яе такой раз'яднанай. Не ўсё так проста. Але дэмакратычныя сілы паступова пачынаюць згуртоўвацца. І трэба гэтую выдатную тэндэнцыю замацоўваць журналістам, а не ператвараць нейкія рэчы ў скандалы. Скандалаў нам хапае*». Як у святле яднання асвятляць журналістам раскол апазіцыі па святкаванні угодкаў БНР, шаноўны Сяргей Іванавіч не патлумачыў.

Акцыю ў нядзелю, 23 сакавіка, ладзіць нацыянальны аргкамітэт па святкаванні ўгодкаў БНР на чале з гісторыкам, сябрам руху БНФ Анатолем Грыцкевічам. Каардынатарам рабочай групы аргкамітэта з'яўляецца нядаўна выключаны з партыі БНФ Вячаслаў Сіўчык. БНФ жа на чале з Вінцуком Вячоркам прыняў рашэнне адзначаць гістарычную дату 25 сакавіка – непасрэдна ў дзень, калі 85 гадоў таму была абвешчаная БНР. Ні адзін, ні другі бок не пажадаў пераступіць праз уласныя амбіцыі. «*Вячорка не пайшоў насустрач аргкамітэту, які звяртаўся да яго скаардынаваць нашыя дзеянні і ўсё ж правесці шэсце ў адзін дзень і агульнымі аб'яднанымі сіламі*, – заявіў Сяргей Законнікаў. – *Нам не ўдалося пераканаць БНФ, што трэба дзейнічаць сумесна, а не распыляць сілы*». Іншы бок прад'ўляе аргкамітэту тыя ж самыя абвінавачанні.

Заяўку на правядзенне акцыі 23 сакавіка ў Мінгарвыканкам падалі тры групы мінчукоў. Месцам збору пазначаная плошча Незалежнасці (перакрыжаванне праспекта Скарыны і вуліцы Валадарскага ля паштамту) а 12-й гадзіне. Далей заяўнікі замаўляюць шэсце па праспекце і мітынг на Кастрычніцкай плошчы. «*Дзень Волі не мае на ўвазе хаджэнне па закутках*, – заявіў Вячаслаў Сіўчык. – *Натуральна, у такі дзень ісці і збірацца на плошчы Бангалор – з гэтым ніхто не пагодзіцца. Усё роўна Дзень Волі адбудзецца ў цэнтры горада. І мы паспрабуем зрабіць усё ад нас залежнае, каб акцыя прайшла мірна. Ва ўсякім разе, я магу дэкляраваць, што з боку арганізатараў ніякіх планаў па захопу прэзідэнцкай адміністрацыі не ставіцца*».

Паводле словаў Вячаслава Сіўчыка, акцыю 23 сакавіка падтрымалі каля 10 партыяў. Сярод іх – Кансерватыўна-хрысціянская партыя БНФ, БСДГ (НГ) і БСДГ. У акцыі возьмуць таксама ўдзел Малады фронт і Партыя свабоды.

Акцыю 25 сакавіка падтрымалі «Хартыя'97», прадстаўнікі Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі, Таварыства беларускай мовы, Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў, мастацкай суполкі «Пагоня». Заяўку як прыватныя грамадзяне падалі Вінцук Вячорка, Уладзімір Кішкурна, Аляксяй Янукевіч і Павел Знавец. Збор замаўляецца а 17.30 на плошчы Якуба Коласа з шэсцем па праспекце Скарыны да скверу Янкі Купалы, дзе мае адбыцца мітынг і канцэрт.

Раздваенне свята, якое дагэтуль адзначалася супольна, адмоўна ўспрынялі і ў аппазіцыйным лагеры. «*Я нікога ніколі не крытыкаваў з палітычных дзеячаў, якія за Беларусь, за незалежнасць*, – пракаментаваў сітуацыю кіраўнік БСДГ Станіслаў Шушкевіч. – *Але, відавочна, лопне хутка і маё цярпенне. Рэжым вельмі цешыцца ад гэтага разладу. А ў нас не хапае ні інтэлігентнасці, ні розуму ўзняцца вышэй за ўласныя амбіцыі. Няма нам чаго дзяліць*».

Раскол святкавання ўгодак БНР зноў не лепшым чынам адаб'ецца і на колькасці ўдзельнікаў, і на іміджы апазіцыі. Апошняй гэтым разам не выпадае наракаць на несвядомасць народа, калі не могуць паразумецца чальцы нават адной палітычнай сілы. У падвешаным стане (куды ісці?) знаходзяцца дагэтуль многія. Аб'яднаная грамадзянская партыя прыняла рашэнне афіцыйна не падтрымліваць ні той, ні іншы бок, бо лічыць недапушчальным дзяліць свята. Але чальцы партыі могуць прыняць удзел у любой акцыі па сваім жаданні.

Дзень Волі шырока будзе адзначацца за мяжой, дзе пражываюць беларусы – ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Германіі, Бельгіі, Англіі і іншых краінах. Вялікая ўрачыстасць запланаваная і ў Празе, дзе ў святкаванні прыме ўдзел вядомы беларускі пісьменнік Васіль Быкаў.

■

ВЫБАРЫ

Дэпутат-анархіст

ЗЬМІЦЕР СЕРАБРАКОЎ

У Гомелі дэпутатам гарсавету абраны Юры Глушакоў, сябра незарэгістраванай Фэдэрацыі анархістаў Беларусі.

Гісторык, супрацоўнік краязнаўчага музэю Юры Глушакоў перамог у другім туры сумленнай барацьбы дырэктара аўтарамонтнага заводу камуніста Малахава. Цікавы быў расклад кандыдатаў: камуніст, анархіст і лібэрал-дэмакрат – зусім як недзе ў Лацінскай Амэрыцы гадоў 60 таму.

Праходзіў Глушакоў як беспартыйны, што не пашкодзіла канкурэнтам (відавочна жырыноўцам) падкідваць у паштовыя скрыні ўлёткі з наступным зьместам: «Каму вы хочаце даверыць будучыню вашу і вашых дзяцей? Малахаў – камуніст. Глушакоў – анархіст».

Аднак «чорны піар» даў зусім зваротны эфект. На сустрэчы з выбаршчыкамі кандыдат тлумачыў сэнс анархізму як плыні ў міжнародным рабочым руху, дзе дырэктарскаму аўтарытарызму супрацьпастаўляецца рабочае самакіраваньне й салідарнасьць. І тады адна з прысутных бабулек уголас сказала: «*Дык гэта Малахаў анархіст! Вунь як свой завод разваліў!*»

Падтрымалі Глушакова й студэнты Гомельскага ўнівэрсытэту.

Без парушэньняў таксама не абышлося. Справа датычылася скрыні для галасаваньня на месцах – была спроба яе панесьці скрыню па кватэрах, дзе маглі быць прыхільнікі дырэктара.

■

НАТАТКІ

Нямецкая свабода беларускімі вачыма

ЮЛІЯ ДРАНЧУК

Мне даводзілі, што за два месяцы ў Нямеччыне можна звар'яцець ад тугі, што там непрыгожыя жанчыны, зануды — мужчын ад іх цяжка адрозьніць, бо кабеты страшэнна асэксуальныя. Два месяцы ў Нямеччыне, паводле ўласнага досьведу, сапраўды зашмат. Але павучыцца ў немцаў і СНД-шных эмігрантаў — рускіх розных нацыянальнасьцяў, як яны самі сябе называюць, — нам ёсьць шмат у чым.



«Жыць зь немкай?!! Ды гэта ж тое самае, што зь немцам!» — гэтак адрэагаваў адзін знаёмы эмігрант на маё пытаньне, ці часта здараюцца шчасьлівыя шлюбы паміж «нашымі» ды «іхнымі».

Сапраўды, немкі не асабліва ламаюць сабе галаву, што апрануць сёньня на працу, каб спадабацца шэфу ці выклікаць зайздрасьць калегаў. Працоўныя дасягненьні даўно ўжо каціруюцца вышэй.

Немкі вельмі падобныя да беларусак, рускіх ды ўкраінак у сваім стаўленьні да макіяжу, вопраткі ды абутку. Макіяж часьцей за ўсё адсутнічае, учэсваньне валасоў — найпростае, каб займала меней часу. Выбар вопраткі падпарадкаваны толькі аднаму прынцыпу: каб было зручна. Тое самае тычыцца абутку.

Ёсьць і яшчэ адзін прынцып у выбары адзеньня: штодзённа абутак мяняецца. Тыя самыя пантофлікі не апранаюць дзень за днём. Хаця б чаргуюць, а звычай немкі маюць 6-7 параў абутку на адзін сэзон. Але ж паводле сучасных беларускіх традыцыяў, большасьць абутку, які выбіраюць немкі, — не тое каб непрыгожы, але папросту *ніякі*.

Ёсьць меркаваньне, што выбар менавіта гэткага адзеньня — даніна фэмінізму, імкненьне прымусіць успрымаць сябе найперш як асобу, а потым ужо — як жанчыну. Яны выхоўваюць сваіх дачок менавіта гэтак.

Нашыя «сюсі-пусі» на тэму «Ой, якая нявеста прыгожая расьце» — малаверагодныя ў нямецкім асяродку. Бо гэта выхоўвае жанчыну ў думцы, што адзінае яе наканаваньне — быць некаму жонкай. А жонка і маці — гэта ўсяго толькі адзін з аспэктаў яе самарэалізацыі. Таму ад пачатку ў дзяўчынцы выхоўваюць пачуцьцё «Я» — я разумная, я цікавая, я шмат чаго дамагуся. Ад самых першых клясаў — ужо ў пачатковай школе — дзецям распавядаюць пра іхныя правы, пра сямейныя абавязкі, пра магчымыя канфлікты і мірныя шляхі вырашэньня.

Для нашага талерантнага ўспрыняцьця, немкі — катэгарычныя фэміністкі. Самі ж яны аспрэчваюць гэткае меркаваньне. Кажуць, што хваля фэмінізму ў іхнай краіне даўно аслабла. Маўляў, няма за што змагацца — дамагліся амаль усяго, што хацелі. А менавіта?..

ЖАНОЧАЯ ГОДНАСЬЦЬ

У 1990 годзе ў Нямеччыне зьявілася новае міністэрства — Міністэрства праблемаў жанчын. Цяпер яго ўжо скасавалі, улучыўшы ў склад Міністэрства па сацыяльных пытаньнях. Гэта адбылося, калі жаночыя правы дасягнулі пэўнае рысы, якую дэмакратычнае грамадзтва палічыла дастатковай.

Натуральна, правы жанчын парушаюцца і ў Нямеччыне — прыкладам, гвалт у сям'і паранейшаму існуе, бо гэта праблема ідзе ад хаты — зь якой сьмецьце і ў немцаў непрынята выносіць.

Але адмысловыя дамы для жанчын (аналяг такіх дамоў існуе і ў Менску) маюць плён — жанчыны зьвяртаюцца па дапамогу ў гэткія ўстановы больш сьмела, чым раней. Сэнс у тым, што калі жанчына цярпіць у сваёй сям'і гвалт, калі яе зьбіў муж ці нехта яшчэ, але яна пакуль не наважваецца зьвярнуцца ў суд ці падаць на развод, калі ёй трэба пабыць сам-насам са сваімі думкамі і параіцца з псіхолягам ды юрыдычнымі супрацоўнікамі, яна зьвяртаецца ў гэты дом і можа пэўны час пажыць там. Ёсьць магчымасьць прытуліць разам зь ёй і ейных дзяцей. Жыве яна там бясплатна — 50 адсоткаў выдаткаў бярэ на сябе зямля (кшталту нашае вобласьці), а частку — камуна (адміністратыўная адзінка).

Гвалт у сям'і нямецкія жанчыны на сёньняшні дзень лічаць ледзь не адзінай сур'ёзнай праблемай. Цягам 2002 году 2 800 жанчын наведалі гэткія дамы ў Ніжняй Саксоніі. Было зарэгістравана 3 000 выпадкаў хатняга гвалту. І гэта толькі вяршыня айсбэргу. Бо гвалту досыць і ў зьнешне шчасьлівых сем'ях — дзе жанчыне лягчэй цярпець, чым паскардзіцца на мужа, які мае высокі статус у грамадзтве і лічыцца паважаным бюргерам. Страх скандалу, імкненьне застацца ў вачах грамадзтва «правільнай» сям'ёй спыняюць нямецкую жанчыну і робяць падобнай да беларускіх.

Яшчэ адзін страх жанчыны, якая цярпіць ад мужа, — страх застацца адной зь дзіцём на руках.

Але шматбаковая падтрымка дзяржавай адзінокіх маці, адмысловае фармаваньне грамадзкай думкі вядуць да таго, што нямецкія жанчыны не надта ірвуцца замуж — зь дзіцём ці безь яго. Што ёсьць, пэўна, стымулам для нямецкіх мужчын...

НЕМЕЦ-БАЦЬКА

Па вуліцах Ганоўэра ходзіць процьма нямецкіх татаў зь дзецьмі на руках, у калысках, у адмысловых заплечніках. Ня ведаю, ці яны папы-адзіночкі, ці папросту сямейныя абавязкі ў літаральным сэнсе дзеляцца напалову, але нямецкія мужчыны цудоўна валодаюць тэхнікай ды мастацтвам супакоіць, зацікавіць малое дзіця, адцягнуць ягоную ўвагу ад «бякі» ды прымусіць без усялякага енку даесьці кашку.

Вельмі шмат можна пабачыць сямейных пар, дзе жанчына папросту ідзе побач, пакуль бацька супакойвае дзіця, калыша, каб яно заснула. Больш за тое, у стасунках дзеці-бацькі мужчына выглядае значна больш пяшчотным, цярплівым і ласкавым, чымсьці жанчына.

Назірала сям'ю, сытуацыя якой красамоўна дэманструе прынцыпы нашага ды іхнага выхаваньня. Цягнік. Сям'я: ён — немец, яна — з Украіны. Дачка размаўляе па-нямецку, але разумее расейскую мову, бо маці нямецкую не ўжывае.

Дарога досыць доўгая, і маці дастае нейкія стравы — печыва, яблыкі. Прапануе дачцы. Дзіцё адмаўляецца. Мама настойвае і пераходзіць ад прапановаў да загаднага тону. Бацька ўмешваецца: «Ты не павінна яе прымушаць. Калі яна хоча, дык возьме, калі не хоча — гэта яе справа!»

Натуральна, Макаранка палічыў бы, што бацькі выхоўваюць дзіця жудасна, ня маючы адзінага меркаваньня. Але справа ж ня ў гэтым. Нямецкія бацькі імкнуцца паказаць дзіцяці:

Заканчэньне на стар. 6

ПРОЕКТ

Продвинутый театр Андрея Курейчика

НИКОЛАЙ КОРНЕЙЧУКОВ

Об Андрее Курейчике заговорили в начале прошлого года, когда стало известно, что в Театре Янки Купалы и в ТБД приняты к постановке его пьесы «Потерянный рай» и «Понтий Пилат». Не успели отгреметь премьеры, а молодой драматург затеял новый театральный проект.

Прошлой осенью Андрей Курейчик стажировался во МХАТе имени Чехова у самого Олега Павловича Табакова. Трех месяцев стажировки хватило на то, чтобы хорошенько изучить театральный климат и рынок Москвы, после чего молодой драматург сделал неутешительный для Беларуси вывод: наша театральная жизнь отстает от российской лет на 5-7.

По мнению Курейчика, в России лет семь назад современная драматургия практически отсутствовала, и современная режиссура тоже. В репертуарах театров доминировала классика и современная зарубежная драматургия. Российских авторов — Григория Горина, Владимира Володина — почти не было видно. И самая серьезная проблема — не существовало пласта современных драматургов, а без этого театр не может нормально развиваться. Россияне поняли это и обратились к западному опыту.

Большие, репертуарные театры не могут себе позволить рисковать, ведь новаторство — это всегда риск. Европейцы начали создавать маленькие, но многофункциональные театральные центры. Такой центр — это не просто театр, а мастерская, лаборатория. И он ставит перед собой задачу показывать все самое новое, что только появляется в театральном мастерстве.

Таким образом, идея Андрея Курейчика о создании в Минске Центра современной драматургии и режиссуры заимствована дважды. Значит, дважды проверена и должна сработать, как сработала в России, где после появления нового поколения драматургов и режиссеров можно говорить о модернизации театра. В Беларуси же театр пока что остается таким, каким он был и несколько десятилетий назад.

Центр Андрея Курейчика — попытка создать изначально европейское театральное учреждение, построенное на европейских принципах, главный из которых — многофункциональность. *«Я считаю, что театр должен заниматься не только спектаклями, но и целым рядом направлений деятельности, связанной с театром: от просветительской до издательско-научной. В том числе — и деньги зарабатывать, иначе мы не выживем»*, — говорит драматург.

У центра не будет постоянной театральной труппы и режиссеров. На каждый спектакль будут приглашаться те актеры и тот режиссер, которые больше подходят для этого. Таким образом, Курейчик планирует решить проблему косности, свойственную, к сожалению, многим нашим театрам. Кроме того, поиск талантливых актеров, режиссеров и драматургов и нельзя осуществить иначе, как пропуская их через такую театральную мясорубку.

Зрителями нового театрального центра станут прежде всего молодые люди, для определения которых Курейчик подобрал слово «продвинутые». Они смотрят качественное кино, читают хорошую литературу и следят за новыми книгами, авторами, и очень хотят увидеть примерно такой же хороший театр — но не могут, потому что его нет.

В том, что класс продвинутой молодежи уже сложился, драматург ничуть не сомневается: *«Для меня доказательство тому — полные залы кинотеатра «Октябрь», когда там идет другое кино. Я вижу клубную молодежь — эти люди зарабатывают хорошие деньги, но не ходят в театр или крайне редко ходят, а мне хотелось бы, чтобы театр стал модным местом. В Москве каждый театр изобретает и обретает свое лицо, привлекательное для его зрителей».*

Новаторский проект Андрея Курейчика поддержали Министерство культуры и Белорусская академия искусств, на учебных сценах которой уже идут репетиции. Актеров и режиссеров Курейчик выдергивает отовсюду. Часто это недавние выпускники академии, которые, отчаявшись заработать на жизнь театром, занялись чем-то более прибыльным. Но о том, каким будет лицо нового театра, говорить еще рано. ■

ДИСПУТ-КЛУБ

Политика и политики глазами молодежи

ЕВГЕНИЙ ФУРСЕЕВ, ГОМЕЛЬ

15 марта в Гомеле состоялась презентация результатов анкетирования студентов в рамках проекта «Политический лидер глазами молодежи». Опрос касался качеств, необходимых кандидатам в депутаты местных советов, предвыборных обещаний и их исполненимости.

Анкетирование гомельских студентов проводилось в течение недели до выборов в местные советы, в самый разгар предвыборной агитации и добровольно-принудительного досрочного голосования опрашиваемых. Но и без того отмечался усиленный интерес респондентов к содержанию анкеты. Всего было опрошено 177 человек, все они являются студентами 2-4 курсов Гомельского государственного технического университета.

Комплекс поставленных вопросов затрагивал несколько важных для исследователя проблем. Во-первых, это имидж политика — вопросы о возрасте и личностных качествах избираемых политиков. Во-вторых, отношение молодежи к самому институту местных советов — вопросы о предвыборных обещаниях кандидатов в депутаты.

В дополнение к выявлению показателей доверия был добавлен фактор ожидания — вопрос о том, каких действий опрошенные хотели бы от избранного ими депутата. То есть выявление наиболее насущных проблем с точки зрения молодежи, решения которых можно было бы ожидать от органов местного самоуправления. В-третьих, в анкету был введен пункт «Что бы вы еще хотели сказать», где еще больше можно проследить именно личностный аспект отношения молодежи к политике в целом и к политикам в частности.

Анкета была не жесткой — опрашиваемым не предлагались заранее определенные варианты ответа, они сами писали то, что считали нужным. Результаты такого способа анкетирования несколько сложны для обработки, но зато дают более богатый материал для анализа.

Презентация опроса стала основой для последующей дискуссии в рамках диспут-клуба по социально-политическим проблемам как о роли местных советов и депутатов, так и о роли молодежи в демократизации политической системы Беларуси.

Презентация вызвала очень большой интерес со стороны студенчества. В помещении общественного объединения «Гражданские инициативы» собралось более 70 человек, что, несомненно, говорит об актуальности поставленной проблемы.

По результатам опроса, наиболее привлекательный возраст политика для молодежи — это 30-40 лет. Особенно высоко котируются политики чуть старше 35 лет. Наиболее частые аргументы за такой возраст — сочетание достаточного опыта и прогрессивных взглядов, крепкое здоровье и стабильная жизненная ситуация, способность быть связующим звеном между молодежью и старшими поколениями.

Что касается более молодых политиков, то минимальным возрастом, как правило, указывается 25 лет. Но примерно 30 процентов опрошенных считают, что до 30-35 лет человек не должен идти в политику, а должен учиться, строить семью и материальное благополучие. К слову заметим, что это показатель некоторой консервативности и политической пассивности студенчества.

Возраст за 50, и особенно после 60, неприемлемым назвали 76 процентов респондентов. Как правило, такой возраст ассоциируется у респондентов с *«коммунистическими»*, *«советскими»* взглядами, консерватизмом и слабым здоровьем.

Что касается образа идеального политика, то можно четко проследить уже ставший традиционным для всего белорусского народа образ честного, решительного, близкого к народу человека. И студенты тут не оригинальны. Кроме того, показательна также традиционная усталость от слов и обещаний, склонность верить человеку дела.

Далее было обсуждено отношение студенчества к предвыборным обещаниям кандидатов в депутаты. Через такую призму можно выявить отношение молодежи к самому институту местных советов, к пониманию или наоборот, непониманию их роли в системе государственной власти, в системе принятия и исполнения решений. В результате обсуждения был выявлен огромный уровень недоверия обещаниям, понимание бессилия, а порой и нежелания депутатов решать те проблемы, которые они призваны были решить. Можно отметить довольно негативное отношение к самому институту местных советов, непонимание его роли и значения в политической жизни страны.

Шла речь и об уровне надежд и упований молодежи. Участники дискуссии все же надеялись, что избранные ими люди хоть каким-то образом поспособствуют решению накопившихся проблем.

Просматривается довольно интересное явление. Молодежь надеется на лучшее и одновременно не верит в обещания. Получается, что представители студенчества видят широкий круг проблем, которые необходимо решить. И хорошо, если этими и не только молодежными проблемами займутся вновь избранные депутаты.

В связи с этим хочется сказать только одну вещь: если депутатам местных советов удастся решить хотя бы часть того, чего от них ожидает молодежь, то мы увидим и улучшение отношения к институту советов в целом, и к отдельным политикам с их обещаниями в частности. Хотелось бы, абстрагируясь от некоторых фактов, верить именно в это.

Одним из главных результатов проведенной дискуссии стало привлечение внимания студентов к тому факту, что они являются довольно серьезной общественной силой, что они не только объект манипуляций, но и вполне критически мыслящие субъекты политики, имеющие свою оригинальную точку зрения.

По результатам диспут-встречи, из ее участников сформировалась инициативная группа по созданию новой студенческой общественной организации, которая на начальном этапе постарается сделать подобные диспут-клубы более-менее регулярными. Именно критическое мышление, поиск новых путей развития, творчество есть необходимые условия для развития демократии. И представители молодежи это прекрасно понимают. ■

НАВІНЫ СНД



Беларусь – Туркменія. Лідары Беларусі і Туркменіі ўвайшлі ў дзясятку найбольш адыёзных дыктатараў сучаснасьці па выніках аналізу, які правёў часопіс *«Parade»* на падставе дадзеных праваабарончых арганізацыяў *Freedom House, Amnesty International і Human Rights Watch.* Пры гэтым пад увагу браліся такія фактары, як зьнішчэньне палітычных апанэнтаў, сытуацыя з правамі чалавека, пагрозы суседнім дзяржавам. Туркменбашы заняў у гэтым хіт-парадзе 7-е месца, а Аляксандр Рыгоравіч – пачэснае 10-е. У тройку пераможцаў трапілі Кім Чэн Ір (Паўночная Карэя), сямейная каманда ў складзе караля Фахда і прынца Абдулы (Саудаўская Аравія), а таксама ірацкі лідар Садам Хусэйн.

Украіна. На страшную знаходку натрапілі апэратыўнікі міліцыі ў горадзе Бярдзянску. У адным з калодзежаў у горадзе былі знойдзеныя трупы 11 жанчынаў. Пра гэтае месца міліцыянты даведаліся ад 30-гадовага мужчыны, які колькі дзён таму прыйшоў у мясцовы аддзел унутраных справаў з павіннай. Ён распавёў, што на працягу апошніх трох гадоў забіў 11 жанчынаў. Пакуль сьледства лічыць даказаным яго спрычыненасьць толькі да самага апошняга забойства 17-гадовай дзяўчыны. Дзеля расьсьледаваньня гэтай сэрыі забойстваў была створаная сьледчая група на чале з пракурорам Запароскай вобласьці. Маньяк зьмешчаны пад варту і чакае накіраваньня на псыхіятрычнае дасьледаваньне.

